*natsionalnoj-biblioteke-340402-2019/ - Дата доступа: 17.04.2020.*

УДК 336.74

**КОЗЮК А.А.,** студэнт
Навуковы кіраўнік - **ПАЛЯКОВА І.А.,** ст. выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

**БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ**

**Увядзенне.** Адным з неад'емных атрыбутаў сувярэннай дзяржавы з'яўляецца яе нацыянальная валюта. Пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў ліпені 1990 года Вярхоўным Саветам Беларускай ССР, на тэрыторыі нашай краіны абарачаліся грашовыя знакі Дзяржбанка СССР, Цэнтральнага банка Расіі. Паўставала пытанне аб аб'яднанні грашовых сістэм Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Аднак, у 1994 г. беларускі рубель атрымаў статус нацыянальнай грашовай адзінкі, а Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь набыў статус адзінага эмісійнага цэнтра дзяржавы.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Даследаванне выканана на аснове інфармацыі і матэрылаў размешчаных на афіцыйных старонках Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, шэрагу навуковых артыкулаў з выкарыстаннем агульнанавуковых метадаў даследавання.

**Вынікі даследавання.** Беларускі рубель пачынае сваю гісторыю з распаду Савецкага Саюза на прыканцы 1991 года. З распадам адзінай палітычнай сістэмы і разбурэннем агульнасавецкай грашовай сістэмы пачалі ўзнікаць на тэрыторыі былых саюзных рэспублік свае грошавыя адзінкі. Напачатку сваей незалежнасці, на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўваліся савецкія грашовыя знакі. Адначасова з імі, для аховы ўнутранага спажывецкага рынка, з 1 студзеня 1992 года была ўведзена купонная сістэма («картка спажыўца»). Крыху пазней у абароце з'явілася і першая нацыянальная валюта незалежай Беларусі – разліковыя білеты Нацыянальнага банка. З 1 ліпеня 1992 года пачалі праводзіцца аперацыі ў безнаяўных беларускіх рублях. У канцы ліпеня 1993 года пачаўся вывад з абарачэння савецкіх рублёў. Аднак, адзіным законным плацежным сродкам Рэспублікі Беларусь беларускі рубель, а ў наяўным абароце – разліковы білет Нацыянальнага банка, становіцца толькі ў кастрычніку 1994 г. пасля прыняцця Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь Пастановы № 3326-XII «Аб плацежным сродку Рэспублікі Беларусь».

Першыя разліковыя білеты былі ўведзены ў маі 1992 г. і мелі вартасці 50 капеек, 1, 3, 5, 10, 25, 50 і 100 рублёў. Білеты Нацбанка ад 1992 г. займелі назву «зайчык» з-за выявы зайца, які бяжыць, на пярэднім баку аднарублёвага білета. Таксама на грошах ад 1992 г. былі выкарыстаны выявы вавёркі, баброў, ваўкоў, рысі, лася, мядзведзя, зубра і розных геаграфічных месцаў. На адваротным баку грошай, якія выпускаліся да 1998 г., калі з-за інфляцыі былі ўведзены адзінкі наміналам больш за 1000 рублеў, выкарыстоўвалася выява дзяржаўнага герба краіны «Пагоня». Наступныя банкноты, узора 2000 года, акрамя паменьшанай колькасці нулёў (3 нулі), і выключэння з серыі грошаў з выявамі жывёл, адрознянняў не мелі. Дызайн сучасных беларускіх грошай быў распрацаваны мастакамі Беларусі і прыняты ў 2009 г., але ўведзены ў абарот грашовыя адзінкі былі толькі з 1 ліпеня 2016 года. У абарачэнне былі выпушчаны сем наміналаў банкнотаў – 5, 10, 20, 50, 100, 200 і 500 рублёў і восем наміналаў манет – 1, 2, 5, 10, 20 і 50 капеек, а таксама 1 і 2 рублі.

Першыя металічныя грашовыя знакі – манеты Рэспублікі Беларусь, былі выпушчаны 27 снежня 1996 года. Гэта памятныя манеты, якія з'яўляюцца законным плацежным сродкам Рэспублікі Беларусь. А 1 жніўня 2013 г. Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь ўведзена у абарачэнне інвестыцыйная манета - залатая зліткавая манета «Славянка».

У 2005 годдзе беларускі рубель займеў свой графічны знак ў выглядзе дзвюх літар лацінскага алфавіту «Br», дзе B – беларускі, r – рубель. «Яго ідэя зводзілася да стварэння

ўласнага абазначэння нацыянальнай валюты Беларусі, арыгінальнага, вядомага і запамінальнага знака, які можна было б лёгка выкарыстоўваць як пры камп'ютарным наборы, так і пры напісанні тэксту ад рукі» [3].

Гісторыя рубля ўяўляе сабой гісторыю краіны і яе эканомікі. Напачатку 1992 года, калі ў Беларусі адначасова абарачаліся савецкія і першыя беларускія грашовыя знакі, афіцыйны абменны курс складаў адзін разліковы білет за 10 савецкіх рублёў. 20 жніўня 1994 г. з-за інфляцыі ў беларускай эканамічнай сістэме была праведзена дэнамінацыя. Намінальная вартасць грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь змянілася ў 10 разоў. Наступная дэнамінацыя адбылася 1 студзеня 2000 г. і змяніла апошнюю прапорцыю ў 1000 раз. Таксама дэнамінацыя была праведзена 1 ліпеня 2016 года, і ў гэты раз прапорцыя склала 1:10000.

**Выснова.** З'явіўшыся ў 90-х гадах 20-га стагоддзя, рубель прайшоў доўгі шлях да яго цяперашняга становішча. За сваё адносна нядоўгае існаванне, ён паспеў стаць як нумезматычнай каштоўнасцю, так і змяніць некалькі дызайнаў, і абзавесціся уласным сімвалам. За гэты час ён быў прызначаны адзінай грашовай адзінкай на тэрыторыі краіны, перажыў 3 дэнамінацыі і гіперінфляцыю ў 90-х. Але цяперашнім часам ён, у выглядзе банкнот і манет, займае заслужанае месца ў кішэнях і на разліковых рахунках жыхароў краіны.

***Літаратура.*** *1. Воробьева, А. Памятные монеты – гордость Республики Беларусь / А. Воробьева // Банкаўскі веснік. – 2010. – сакавік. – С. 111-114. 2. Масько, И. Белорусскому рублю – 25! / И. Масько // Банкаўскі веснік. – 2019. - верасень. – С. 65-72. 3. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.nbrb.by. – Дата доступу: 24.02.2020. 4. Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://belstat.gov.by. – Дата доступу: 4.03.2020.*

УДК 94(41/99)

**КОНОНЧУК Н.И.,** студент
Научный руководитель - **ДЕМИДОВИЧ Т.В.,** ст. преподаватель
УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины», г. Витебск, Республика Беларусь

## ПРИЧИНЫ РАЗВОДОВ В ПЕРВЫЕ ГОДЫ БРАКА

**Введение.** В мире с каждым днем растёт количество разводов, наиболее часто – в первые годы брака. Люди сталкиваются с множеством проблем, такими как: притирка, разные взгляды на жизнь, желание иметь все и сразу, желание одного партнера завести детей и отказ от продолжения рода у второго супруга, проблемы с зачатием ребенка (проблемы у одного из пары со здоровьем), отчуждение и т.д. Чаще всего люди вместо того, чтобы искать корень проблем, сразу выбирают простой, на первый взгляд, способ решения проблем – развод.

**Материалы и методы исследований.** Материал исследования – научная литература по рассматриваемой теме. В процессе исследования использовались следующие методы: диалектический, системного анализа, синтеза, исторический и логический.

**Результаты исследований.** На сегодняшний день развод, к сожалению, считается нормой в обществе. Согласно статистике, распадается каждый второй брак. В первые годы совместной жизни разводы происходят чаще. В первый год совместной жизни – 5%; от 1 до 2 лет – 20%; от 3 до 4 лет – 25%; от 5 до 9 лет – 30%. Таким образом, в первые четыре года процент распавшихся семей составляет почти 50%. Также статистические данные показывают, что самые крепкие браки те, которые были заключены с 20 до 30 лет. Браки, заключённые после 30 лет, не всегда удачны, так как людям сложно перестроится, например, перестроить быт, думать и заботится не только о себе, но и о своей половинке [1, с. 126].

Большинство разводов происходят в период с 18 до 35 лет. В 65% случаев суд предлагает время на то, чтобы передумать, в среднем это от 1 до 3 месяцев. Забирают